Лысак К.Ф., студ. гр. 311 ФКіСКД
БГУКМ
Навуковы кіраўнік – Спірына А.А.,
кандыдат культуралогіі

# КРЫВІЦКІ МІФ ВАЦЛАВА ЛАСТОЎСКАГА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Крывіцкая тэорыя – канцэпцыя аб паходжанні беларускай народнасці, згодна якой продкамі беларусаў з’яўляецца племя (або, дакладней, саюз плямёнаў) крывічоў, якое засяляла тэрыторыю верхняга Нёмана, Дняпра, Дзвіны і верхняй Волгі. Ёсць меркаванне, што фарміраванне крывічоў адбывалася у другой палове I - пачатку II тыс. з удзелам балтаў, славян і заходнефінскіх плямёнаў [2]. У той альбо іншай ступені, прыхільнікамі гэтай тэорыі былі такія даследчыкі як М. Доўнар-Запольскі, У. Ігнатоўскі, М. Кастамараў, Я. Станкевіч і іншыя. У сваіх даследаваннях гэтыя дзеячы абпіраліся пераважна на летапісныя, лінгвістычныя і археалагічныя крыніцы.

Але, верагодна, самым заўважным прыхільнікам крывіцкай тэорыіі, з’яўляецца найвыбітнейшы дзеяч беларускага адраджэння пачатку XX ст. Вацлаў Юстынавіч Ластоўскі (1883-1938). Галоўным феноменам гэтай асобы з’яўляецца тое, што так і не атрымаўшы вышэйшай адукацыі, ён здоліў праявіць сябе як даследчык ў такіх галінах як філалогія, этнаграфія, гісторыя, дзякуючы самаадукацыі і шырокім энцыклапедычным ведам. Важным, таксама, з’яўляецца палітычная і грамадская дзейнасць гэтай асобы: удзельнік БСГ, рэдакцыйны сакратар “Нашай нівы”, прэм’ер-міністр БНР. З’яўляецца аўтарам Кароткай гісторыі Беларусі, Расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка і інш [4].

Магчыма, самым заўважным дасягненнем Вацлава Ластоўскага з’яўляецца стварэнне на базе крывіцкай тэорыі так званага “крывіцкага міфа”, які сцвярждаў існавване развітой беларускай цывілізацыі яшчэ з часоў Полацкага княства. Згодна поглядам, якія панавалі ў асяроддзі беларускай інтэлігенцыі на пачатку XX стагоддзя, народ мае поўнае права на існаванне

ўласнай нацыянальнай дзяржавы, калі такая мелася быць ў мінулым. Вацлаў Ластоўскі бачыў пачатак беларускай дзяржаўнасці менавіта яшчэ ў дахрысціянскім перыядзе.

У гады свайго стварэння, крывіцкі міф Вацлава Ластоўскага меў вельмі істотнае значэнне. На той час бачанне мінулага, сучаснага і будучыні беларускага народа развівалася ў кантэксце традыцыі, закладзенай яшчэ Францішкам Багушэвічам. Крывіцкая тэорыя выступала насуперак ўяленням аб беларусах як аб народзе пакутнікаў, згубіўшых сваю шчаслівую долю, які увесь час прымушаны трываць цяжкі прыгнёт і марнавацца ў цяжкай працы. Крывіцкая тэорыя падкрэслівала значэнне дахрысціянскага перыяду гісторыі беларусаў як часу росквіту магутнай “крывіцкай цывілізацыі” [1]. У сваём мастацкім творы “Лабірынты”, В. Ластоўскі праводзіць аналогіі паміж крывіцкім, антычным, індыйскім і вавілонскім светам. Такім чынам, ён надае годнасць і вартасць беларускай культуры вогуле. ”Крывіцкі міф” быў накіраваны на тое, как падкрэсліць высокароднасць паходжання ідэй беларускага адраджэння, зрабіць ідэю неабходнасці ўзнаўлення беларускай дзяржавы  больш пераканаўчай і прывабнай, як у вачах інтэлігенцыі, так і простага народа.

У існаванні крывічоў В. Ластоўскі вылучае некалькі этапаў. Першы з іх - перыяд да X стагоддзя, калі продкі сучасных беларусаў выступаюць як саарганізванае нацыянальные і палітычнае цэлае пад найменнем крывічы.

Другі перыяд – гэта X-XIII стагоддзі, то бок, час ад прыняцця хрэсціянства да запанавання літоўскай дынастыі. Гэта так званы крэўска-рускі перыяд, калі крывіцкія землі захапілі варагі, а для ўсіх усходнеславянскіх плямёнаў, якія вызнавалі балгарскі варыянт візантыйскага хрэсціянства, выкарыстоўвалася назва русы, русь.

XIII стагоддзе – надыход літоўскай дынастыі. У гэты перыяд адбылася канчатковая замена дзяржаўнай назвы “крывічы” на “літву”. Ад 1386 году – і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да разделаў Рэчы Паспалітай, адбываецца панаванне палякаў. З-за прыняцця кіруючай элітай каталіцтва, адбываецца разрыў паміж ёй і народам. Назва "русь" у той час працягвала выступаць ў якасці рэлігійнай.

Апошнім перыядам Вацлаў Ластоўскі вылучае беларускі, які пачынаецца ад падзелаў Рэчы Паспалітай.

Як адзначае аўтар, з 1831 па 1861 год, адмысловымі ўстановамі Расейскай імперыіі праводзіліся этнаграфічныя даследванні беларускіх земеляў. Некаторыя даследчыкі побач з назвай беларусы выкарыстоўвалі і назву "крывічы". Але пасля 1861 года сітуацыя змянілася – разам са знішчэнням пальшчызны нішчылася і беларускае (крэўскае) і ўкраінскае адраджэнне. Назва "крывічы" была амаль цалкам выціснута з ужывання і у наступным выкарыстоўвалася толькі некаторымі літаратарамі-адраджэннцамі.

З усяго вышсказанага, Вацлаў Ластоўскі робіць выснову, што з усіх трох гістарычных назваў нашага народу (крывічы, літвіны, русь), толкі першая з'яўляецца сапраўднай саманазвай, таму і больш дасканалай.

Як адзначаюць некаторыя даследчыкі, галоўнай хібай крывіцкай тэорыіі з'яуляецца вылучэнне толькі крывіцкіх плямёнаў як асноваствральнікаў беларускай народнасці, без уліку уплыва другіх плямёнаў, як славянскіх так іх балцкіх. Але В. Ластоўскі мае сваё тлумачэнне на дадзеную заўвагу: "Мы крывічы па крыві, па роду – племені, але засяляем землі балотныя і лясістыя. Дзеля гэтага, каторыя з нашага племя жылі на дрыгве-балоцe, па гэтай азнацы звалі іх дрыгавічамі, а каторыя жылі ў лясах-дрэвах – зваліся драўлянамі, каторыя жылі на горках – зваліся гаранамі. Адна галіна крывічоў, пад кірункам радавых старшын Радзіма і Вяткі, перасялілася з захаду на ўсход, з ляшскага пагранічча ў парэчча Сожа і тут размножылася. Дзеля гэтага і драўляне, і дрыгавічы. І гаране, і радзімічы, і вяцічы, - адно крыўскае племя, адзін, як даўней казалі, язык" [3, с. 366]. Гэта значыць, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. Ластоўскі называе крывіцкімі плямёнам, таксама, і і іншыя, якія удзельнічалі ў фарміраванні беларускай народнасці. У свой час іншы даследчык, Ян Станкевіч, растлумачыў гэтую з'яву імкненнем іншых плямёнаў пераняць культурныя рысы крывічоў як больш развітых і прагрэсіўных. Разам з перанятымі культурнымі рысамі на гэтыя плямёны пашырылася назва "крывічы".

"Крывіцкі міф" палучыў досыць шырокае распаусюджанне у Заходняй Беларусі і ў эмігрыцыі [1]. Нажаль, ён не здоліў замацавацца як след у масавай свядомасці. Тым не менш, ён і да гэтуль адыгрывае важнае культурнае і гістарычнае значэнне. як пісаў сам Вацлаў Ластоўскі: "Сягоння, калі народ сіліцца адрадзіцца ад самых каранёў сваіх і шукае старанна кожнага ценю свае індывідуальнасці (у мове, у абычаях, у мастацтве і пісьменнасці, важна прыпомніць яму яго ўласнае імя, у дадатку – імя, каторае гаворыць аб лепшых днях жыцця нашага народа, з яго вольнымі вечамі і слаўнымі змаганнямі за сваю незалежнасць"[3, с. 384]. Такім чынам, даследаванні крывіцкага міфу як папярэдняга вопыту з'яўляецца важным чыннікам ў пошуках далейшага шляху развіцця беларускай нацыі, пошуках яго тоенснасці і ідэнтычнасці.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Акудовіч. В. Код адсутнасці (Асновы беларускай ментальнасці) / В.Акудовіч - М.: Выд. І.П. Логвінаў, 2008. - 197 с.
2. Клімковіч І. Міфалогія беларусаў: Энцыкл. Слоўн. / склад І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. Рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Минск: Беларусь, 2011. – 607 с.: іл.
3. Ластоўскі, В. Ю. Выбраны творы / В. Ю. Ластоўскі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. – 512 с.

http://kryuja.org/

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ